**Эдуард Акулін**

# „Напачатку была Песьня”

## Выбранае

**Менск**
**2003**

# Эдуард Акулін
# Песьня пачыналася з Бесядзі…

**Эдуард Акулін** нарадзіўся 7 студзеня 1963 годзе ў вёсцы Вялікія Нямкі на Гомельшчыне. Скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны і асьпірантуру  АН Беларусі. Працаваў настаўнікам, загадчыкам філіі Літмузея М.Багдановіча "Беларуская хатка", намесьнікам галоўнага рэдактара часопіса "Першацьвет", рэдактарам аддзела паэзіі часопіса "Полымя". Цяпер -- намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Дзеяслоў", а таксама намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Аўтар кніг паэзіі : "Пяшчота ліўня"(1990 г.), "Крыло анёла"(1995 г.), драматычнай містэрыі "На Каляды"(1996 г.), "Радно"(2000 г.), "Непрычалены човен" (2003 г.),  магнітаальбомаў : "Мая Крывія"(1995 г.), "Як яна і я"(2000 г.) і кампактдыску "Напачатку была Песьня" (2003 г.).

Лаўрэат другой прэміі 1-га ўсебеларускага фестывалю бардаўскай песьні (1993 г).

**Чужая жонка**

Am Dm
Згатуеш двайную каву,
E Am
Закрыеш на ключ кватэру
Am Dm
І знойдзеш сабе падставу
G C
І змусіш мяне паверыць.
$A_7$ Dm
Патушыш таршэр у куце,
G C
Слязою шчаку асьвеціш
Am Dm
І нават прасіць ня будзеш,
E Am
Каб я цябе зноўку стрэціў.

*Прыпеў:*

Am Dm
Час надыходзіць гаварыць,
G C
а што сказаць табе – ня знаю,
Am Dm
Лягчэй да раніцы любіць,
E Am
чым мовіць здраднае «кахаю».

Паправіш пасцель на золку,
Акно на ўсход раскрыліш,
І станеш чужою жонкай,
Хоць мужа свайго ня кінеш.
Запаліш таршэр у куце,
Схаваеш слязу ў гарсэце…
І нават прасіць ня будзеш,
Каб я цябе зноўку стрэціў.

*Прыпеў:*

Час надыходзіць далей жыць,
а як мне жыць пасля такога?
Анёла з д'яблам прымірыць –
павек ня вымаліць у Бога…
Анёла з д'яблам прымірыць –
павек ня вымаліць у Бога…

**Мая крывія**

C
Зямля векавых бароў ,
Am
Зямля васільковай рані,
Dm
Зямля залатых буслоў
G
У промнях касых сьвітання.
C
Зямля верасовых сноў ,
Am
Зямля зьвечарэлых плёсаў ,
Dm
Зямля, у чыіх сыноў
G
Трагічней ня знойдзеш лёсаў …

*Прыпеў:*

C
Гэта – мая Крывія,
Am
Гэта – твая Крывія.
Dm
Бусел на досвітку
G
З ліпы ныр цуе ў сінечу…
C
Гэта – мая Крывія,
Am
Гэта – твая Крывія.
Dm
Хай жа палёт яго
G C
Доўжыцца цэлую вечнасць.

Зямля шугавей зімовых
Вясною ў кронах груш,
Зямля нескаронай мовы
І самых адкрытых душ…
Зямля самых сумных песень,
Зямля самых белых рос,
Зямля, дзе маё Палессе,
Світае карой бяроз.

*Прыпеў:*

KAMUNIKAT.org

**Жоўтая вяргіня**

Am  Dm            E               Am
Я цябе не прысніў ні разу
      Dm            E          Am
За такое даўгое лета,
          Dm                 G            C
Хоць душа, як пустая ваза,
      Dm                                   E
Сумавала бяз любай кветкі…

*Прыпеў:*

      Dm      G
Што казаць аб тым,
      C          Am
Што каханне – дым…
Dm                              E                    Am
Нам ня сьвеціць зорка давідна.
Dm          G
У жыцьці тваім,
C           Am
У жыцці маім
Dm                         E                    Am     (Dm G C Am Dm E Am)
Жоўтая вяргіня расьцвіла.

Я цябе не прысьніў ні разу
За такое даўгое лета.
У душу, быў пустую вазу,
Назьбіраў выпадковых кветак…

*Прыпеў:*

*Апошні рэфрэн*:
Жоўтая вяргіня, жоўтая вяргіня,
Жоўтая вяргіня расьцвіла.
Жоўтая вяргіня расьцвіла.

KAMUNIKAT.org

**Сумую без тваіх воч…**

Am
Сумую без тваіх воч,
C
Бяз кос тваіх смолі чорнай –
Dm
Чакання майго ноч
F E
Ня стане ад сьлёз зорнай.
Сумую без тваіх губ,
Бяз рук дарагіх пяшчоты –
Надзеі маёй зруб
Пад дахам адзіноты.

*Прыпеў:*

Dm G C Am
Сумую… Мільён слоў
Dm E Am $A_7$
Ня хопіць на смутак гэты.
Dm G C Am
Запозненым рэхам сноў
Dm E Am
Вяртаешся да мяне ты.
Dm G C Am
Запозненым рэхам сноў
Dm E Am
Вяртаешся да мяне ты.

Сумую без тваіх плеч,
У страту мне іх ня верыцца.
Пакуты маёй меч
Працяў навылёт сэрца.
Сумую без тваіх воч,
Бяз кос тваіх смолі чорнай –
Надзеі маёй ноч
Ня стане ад слёз зорнай.

*Прыпеў.*

KAMUNIKAT.org

**Забудзься…**

      Am                    Dm
Забудзься, як човен пяшчоты нас нёс
      E                     Am
Насустрач расчуленым хвалям.
      Am                      Dm
Забудзься, як небам спакушаны плёс
    E                     Am
Сузор’яў дарыў нам каралі.
      $A_7$
Ня помні, ня поўні ў пойме смугі
                        Dm
Ня крылаў купальскае ночы,
                      Am
Ня першай залевы валос на лугі,
    Dm                  E
Ня сумам змялелыя вочы.

    Dm        E       Am
І нат калі тыльную сутву душы
    Dm          E       Am
Ахрыплая выступдзіць замяць,
   Dm      G        C       Am
Нічога нікому пра нас не кажы –
   Dm          E      Am
Маўляў, блізарукая Памяць…

       Dm         E    Am
Я ня знаю, як буду цябе забываць,
    Dm         E           Am
Забываць – выспу сноў чыстаганіць.
    Dm         G        C        Am
Забываць – як цьвікі у труну забіваць,
       Dm              E       Am
Што была для нас чоўнам Кахання.

       Dm      E            Am
Я ня знаю, як буду, ці буду зусім,
    Dm               E     Am
Без цябе, маёй доннай лілеі,
    Dm          G                C       Am
Без цябе, як асьлеплы бяз вогнішча дым,
      Dm       E          Am
Я да ранку дажыць не здалею.
    Dm        E         Am
Забудзься, ня помні, згары,
    Dm        E         Am
Забудзься, ня помні, згары,
    Dm       G   C      Am
Забудзься, ня помні, згары,
    Dm        E          Am
Забудзься, ня помні, памры.

**Зорка Максіма**

Am
Месячнай цёплай ноччу,
F
Шляхам апошнім Млечным
Dm
Ціха ў сусвет пакрочу,
E
Буду сабе сьвяціць.
Am
Каб і адтуль, з вышыняў,
F
Каб і адтуль, з далечы,
Dm
Бачыць цябе, Радзіма,
E
І, як цяпер, любіць…

*Прыпеў:*

Am F
Я не баюся, я не шкадую,
Dm E
Для Беларусі лёс ахвярую.
Am F
Мне не балесна, нават не горка
Dm E Am
Над пералескам вызірнуць зоркаю.

Калі вам стане цяжка,
Скрушна, няўтульна ў сьвеце,
Гляньце на неба – кажуць,
Там мая зорка сьвеціць…

*Прыпеў*:

KAMUNIKAT.org

**Пагоня**

E Am                                                    E
Прыземістыя коні іржуць пад седакамі,
                                                               Am
Трапеча сцяг з «Пагоняй» над Вітаўта палкамі.
  $A_7$                                                  Dm
Яшчэ забралы ўзьняты і меч незатупелы,
                              Am
Патрапіць праміж латаў
  E                          Am
Яшчэ ня мецяць стрэлы.

*Прыпеў:*

E Am                          Dm
Пагоня, ляціць Пагоня,
    G                             C                         E
І коні хрыпяць наўзрыд, пяюць наўзрыд,
  Am                         Dm
А воля на ратным полі
E                                   Am E
Мільгнула між лесу дзід.

А ў сонечным бязьмежжы лунае горда бусел,
Як сімвал незалежнай, свабоднай Белай Русі.
Яшчэ забралы ўзьняты і меч незатупелы,
Патрапіць праміж латаў
Яшчэ ня мецяць стрэлы.
Патрапіць праміж латаў
Яшчэ ня мецяць стрэлы.

*Прыпеў:*

Пагоня – гоня – гоня – гоня полем ляціць.
І коні, коні, коні,коні плачуць наўзрыд.
А воля, воля, воля, воля, воля, глядзі,
Мільгнула між лесу дзід.

KAMUNIKAT.org

**Вальс**

```
   Am
Час не шкадуе нас,
   Am
Будзем і мы старэць,
   G                 C
Трэба і нам свой вальс
   Dm              E
Датанцаваць пасьпецць.
Dm      Am      E           Am
А-а-а-а-а, датанцаваць пасьпецць.
```

*Прыпеў:*

```
   F     G      Am
Гукаў плыве рака,
   F   E      Am
А на маім плячы
   F    G        Am
Ваша ляжыць рука –
   Dm       E    Am
Кружымся і маўчым.
```

Жыць можна толькі раз,
Раз можна шчасьце мець,
Трэба і нам свой вальс
Датанцаваць пасьпецць.
А-а-а-а-а, датанцаваць пасьпецць, бо…

*Прыпеў:*

Гукаў плыве рака,
А на маім плячы
Ваша ляжыць рука –
Кружымся і маўчым.

Стомлены профіль Ваш
Хіліцца долу ледзь.
Трэба і нам свой вальс
Датанцаваць здалець.
А-а-а-а-а, датанцаваць здалець/ 2, бо…

*Прыпеў.*/ 2 разы.

KAMUNIKAT.org

**Калыханка**

*Уступ:* Дm Am E Am/ Дm Am E Am

Am
Па арэліках да нас
Dm E
Ноч спусьціцца мусіла,
Am
Значыць, час прыходзіць спаць
Dm E
Дзеткам – беларусікам.

*Прыпеў:*

Dm Am
Баю – бай, баю – бай,
E Am $A_7$
Рэчка сьпіць, дрэмле гай.
Dm Am
Баю – баю, баю – бай,
E Am
Вочкі змружваюцца хай.
Dm Am
Баю – баю, баю – бай,
E Am
Сьпі, сыночак, засынай.

За вакном маленькі гном
Зорны тчэ абрусік нам.
Хай прысьняць чароўны сон
Дзеткі – беларусікі.

*Прыпеў:*

Баю – бай, баю – бай,
Рэчка сьпіць, дрэмле гай.
Баю – баю, баю – бай,
Вочкі змружваюцца хай.
Баю – баю, баю – бай,
Вочкі змружваюцца хай.

## Гэта восень

Am
Гэта восень
Dm
У коміне злосна галосіць.

E
Гэта кроплі дажджу
Am E
На запыленым шкле.
Am
Гэта просінь
$A_7$ Dm
Растайнага выраю просіць.
F
Гэта восень –
E
Пралог немінучы к зіме.

*Прыпеў:*

Am
Я не чакаю, не прыходзь,
Dm
Я не чакаю, не звані,
G
Я не чакаю, мімаходзь
C E
Сама сабе ты не мані.
Am
Я не чакаю, толькі дождж
Dm
Цалуе зноў твае сьляды.
F
Я не чакаю… Гэта ноч
E
Цябе забрала назаўжды…

Гэта восень
Лістотаю сьцежкі заносіць.
Гэта лета згарае на алтарах.
Гэта восень…
Стаю на самотным парозе.
Гэта восень…
А сьледам за ёю зіма.

*Прыпеў.*/ 2 разы.

AMUNIKAT.org

**Ты пакліч мяне, пазаві...**

Am Dm
Ты пакліч мяне, пазаві,--
E Am
мы загубімся ў росных травах...
Am Dm
Пачынаецца ўсё з юбві
E Am
і заканчваецца таксама.

A7 Dm
Пачынаецца ўсё з любві
G C
пацалунак, жыцьцё, дарога...
Am Dm
Ты пакліч мяне, пазаві,--
E Am
аднаго я малю у Бога.

За табою усьлед пайду,
палячу сьсірацелым ветрам,
калі нават цябе знайду,
я на іншым баку Сусьвету.

Ты пакліч мяне , пазаві,
мы загубімся ў росных травах...
Пачыналася ўсё з Любві
і заканчваецца таксама.

Рэфрэн:
Пачыналася ўсё з Любві
ізакончылася тамсама.

AMMUNIKAT.org

**Страцім – Лебедзь**

Am                                Dm
Я помню, што гэта ўжо колісь было,--
E                          Am
Каляды. Завейная шчырасьць.
Am                           Dm
Сумёт за балоньнем -- узьнятым крылом
E                             Am
Луг-Лебедзя гнанага ў вырай.
A7
І ты ўсьлед за ім, як крывіцкі Ясон,
                                Dm
памкнуўся, паверыўшы ў мару,
                       Am
а Слуцкага паса цяжкое руно --
Dm               E          Am
царкоўным зазьзяла арнатам...

*Прыпеў:*
Am                Dm    G
Столькі вёсен і зім --адзін.
                  C       Am
Ты даруй нам усім, Максім!
Am               Dm           E
Безьязыкім, сьляпым, глухім
E              Am
і душою парожнім...
Столькі вёсен і зім, і зім
Ты вышэй ад усіх, Страцім,
да цябе мы усе ляцім --як можам.

Ды раптам з нябыту узьнікла Яно
паўночнай парой сягодзім'я --
валошка,што ўмерзла ў ваконнае шкло --
пагляд твой растайны, Максіме.
Няма таго болей,што колісь было
і я аб тым не шкадую,
ды толькі валошка твая  ўсё адно
карэннем мне сэрца сьвідруе...

*Прыпеў:Апошні рэфрэн:*
Да цябе даляцець нам сіл--дай Божа!..

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

**Смак ажын**

        Am                              Dm
Мой погляд размылі туманы,
        E                               Am
Мой гнеў, як загублены нож,
        Am                              Dm
Мой смутак, нібы несьціханы
        E                              Am
Кастрычніцкі помсьлівы дождж.
        $A_7$                          Dm
Твой погляд – зялёная зорка,
        G                              C    E
Твой гнеў – ненароджаны сын,
          Am                           Dm
Твой смутак пранізьліва-горкі,
      E                              Am
Як смак недаспелых ажын.

*Прыпеў:*

    Dm              G              C                Am
Не кажы, не кажы, не кажы мне бывай,
    Dm              E              Am
Не кажы, не кажы, не кажы.
          Dm              G              C            Am
Смак ажын, смак ажын, смак ажын успамінай,
          Dm              E                Am
Смак ажын, смак ажын, смак ажын.

    Dm              E              Am
Я веру, што вернецца лета
    Dm                E              Am
З маленнем растайнай імшы.
  Dm                G              C
І словы над сонным Сусветам:
    Dm          E              Am
Нічога, прашу, не кажы.

*Прыпеў:*

Не кажы, не кажы, не кажы мне бывай,
Не кажы, не кажы, не кажы.
Смак ажын, смак ажын, смак ажын ўспамінай,
Смак ажын, смак ажын, смак ажын.
Не кажы, не кажы, не кажы мне бывай,
Не кажы, не кажы, не кажы.
Смак ажын, смак ажын, смак ажын ўспамінай,
Недаспелых, гаркавых ажын.

KAMUNIKAT.org

**Як яна і я**

Dm
Плыла восень над зямлёю –
Am
Я сустрэў яе.
Dm                          Am
Калі птушкі чарадою адляцелі ўсе.
Dm            G                        C          Am
Адзінокі сумны лебедзь не сьпяшаў ляцець
Dm            Am                 Dm      E          Am
Сваю  белую сяброўку марыў ён сустрэць.

*Прыпеў:*

Dm  E     Am
Як яна і я,
Dm  E     Am
Як яна і я,
Dm   G     C  Am
Як яна і я, я,
Dm     E  Am
Як яна і я.

Ды зіма неспадзявана забяліла сад
І яе са мной ня стала, як і не паткаў.
Толькі лебедзь на азёрах стрэўся з мараю,
І забыў пра вырай цёплы з любай параю.

*Прыпеў:*

У людзей вось так бывае: восень – час кахаць,
Ды зіма неспадзявана прыйдзе ўсё адняць.
У людзей вось так бывае, у зямных людзей,
Толькі іншае каханне ёсць у лебядзей.

*Прыпеў.*

KAMUNIKAT.org

**Начная ластаўка**

```
Am         F     Dm           E
3-12-45 – я сьпяшаюся набраць,
Am                            F
Толькі чую кожны раз
  Dm                  E
Я маўчанне у адказ.
```

*Прыпеў:*

```
Dm           G           C
Памяць тэлефонная –
Dm          E     Am
Ненадзейная такая,
Dm              G          C
Як сьвятло твайго крыла,
Dm           E        Am
Ластаўка мая начная.
```

Цяжка ў памяць мне званіць,
Ды цяжэй цябе забыць.
Вінаваты толькі ён,
Твой маўклівы тэлефон.

*Прыпеў:*

Памяць тэлефонная –
Ненадзейная такая,
Як любоў уся твая,
Ластаўка мая начная.
Ластаўка мая ручная…
Ластаўка мая начная.

KAMUNIKAT.org

**Мае сны без цябе пустыя…**

Am Dm
Мае сны без цябе пустыя,
E Am
Спаць кладуся, нібы ўміраю.
Am Dm
Сам спаліў за сабой масты я,
E Am
Калі вымавіў: “Не кахаю”.
$A_7$ Dm
Ды з надзеяй аб новай стрэчы
G C
Ад самога сябе наўпотай
Am Dm
Непатушанай кіну сьвечку
E
Я ў забытай царкве пяшчоты.

*Прыпеў:*

Dm G C Am
Я – адзін, ты – адна,
Dm E Am
Дзень дагарэў, і патухла святло лілеі.
Dm G C Am
Я – адзін, ты – адна,
Dm E Am
Жыць паасобку наўрад ці далей здалеем.

І няхай болей мы не тыя,
І на досвітку не лятаем,
Толькі сполахі залатыя
Нашы душы яшчэ кранаюць.
Бо з надзеяй аб новай стрэчы
Ад саміх жа сябе наўпотай
Ты і я пакідаем сьвечкі
У забытай царкве пяшчоты.

*Прыпеў:*

KAMUNIKAT.org

**Возера ночы**

```
  Am                  E              Am
Паміж намі – возера ночы,
  Am         E          Am
І ў чорнай яго вадзе
  Dm                    G          C
Пахаваў я свой грэх аднойчы
  Dm             E          Am
І ад Бога, і ад людзей.
```

Чым становішся ты мне бліжай,
Тое возера ўсё глыбей.
І ўжо памяць не плыт, а крыж мой,
Што ўрос у прадонны глей.

*Прыпеў:*

```
  Dm
Але чаму тады, скажы,
     Am
Так соладка на тым крыжы
  Dm
Мне паміраць і далей жыць
  E          Am
Чаму, скажы?
  Dm
Няхай з гадамі ўсё радзей
  Am
Цвітуць лілеі на вадзе –
  Dm
Ад іх сьвятла ўсё глыбей
  E                        Am
Начное возера надзей.
```

Паміж намі – вакно нябыту,
Зазіраю ў яго ізноў.
І ўжо памяць ня крыж, а плыт мой,
Што вяртае на выспу сноў.

*Прыпеў:*

```
  Dm
Я ведаю чаму тады
  Am
Так соладка на тым крыжы
  Dm
Мне паміраць і далей жыць –
  E                          Am        A7
Таму што ёсьць са мною ты.
  Dm
Няхай з гадамі ўсё радзей
  Am
Цьвітуць лілеі на вадзе
  Dm
Ад іх сьвятла ўсё глыбей
  E                         Am   E  Am
Начное возера надзей.
```

KAMUNIKAT.org

**Амур і сумны, і прыгожы...**

Словы М. Багдановіча

Am                                  Dm
Амур і сумны, і прыгожы
E                                          Am
Стаіць з павязкай на вачах
                   $A_7$                        Dm
Ля склепа. Часам лёгкі пах
                   F                        E
Сюды даносіцца ад рожы.
                        Dm        E                  Am
Паўсюль вянкі, крыжы. Чаго жа,
                      Dm           E             Am
Тут, дзе магілы, сьцень і прах
   Dm                   G                C
Амур і сумны, і прыгожы
   Dm                                       E
Стаіць з павязкай на вачах?
        Dm             E                    Am
І ціха думаў я: Быць можа,
                      Dm            G                    C
Любоў, палёгшы побач у трунах,
                 Dm          E             Am
Перамагла і сьмерці жах
   Dm                     G            C
Перамагла і смерці жах
   Dm                    E                 Am
Любоў, палёгшы ў трунах.
                      Dm              E                  Am
Дык адпачніце, покуль на старожы
Dm                       E                Am
Амур і сумны, і прыгожы.

KAMUNIKAT.org

**Гэта мы!**

E    Am
Над Радзімаю - ноч Савы,
                  F
Цень драпежны ўпаў на пожні.
              G
Хто адстоіць твае правы,
           E
Мой народ, хіжых сіл заложнік?!

Чуеш звон з тагасьветных лёх?
Пад пагоні харугвы стала
Бараніць што нам зычыў Бог
Рацьад Вітаўта да Купалы.

*Прыпеў*:

E  Am                   F
Гэта – я, гэта – ты,
          G             E
Гэта мы! Гэта мы!

Рана келіх хаўтурны піць
Па Айчыне, душой збалелай,
Покуль небам скрозь ноч ляціць
Бусел – сьцяг бел-чырвона-белы!

*Прыпеў*:

KAMUNIKAT.org

**Забяры мяне ў дождж валасоў…**

Dm $A_7$ Am F C Dm Dm $A_7$ Dm

Dm $A_7$ Am
Сарамліва ў люстра ракі
Dm $A_7$ Dm
Ты сама на сябе паглядзела,
F $A_7$ Dm
І каса паслухмяна з рукі
$A_7$ Dm
Мілавіцай асыпала цела…

*Прыпеў*:

F C Dm
Покуль сон не раскрыў парасон,
F C Dm
Захінаючы нас ад спакусы,
$A_7$ Dm
Забяры мяне ў дождж валасоў
$A_7$ Dm
І пяшчоту расчуленых вуснаў.
F C Dm Dm Dm $A_7$ Dm
Най-на-на-на-на-на…

П'яна восенню пахлі лугі,
Ветах зьнічкамі плёс зацярушыў,
А туман паяднаў берагі
І азяблыя нашыя душы.

*Прыпеў*.

KAMUNIKAT.org

**Пане гаспадару**

```
     Am        Dm             E           Am
Шчокі, вусны, плечы маладыя
     Dm         G                             C
Марозы, завеі, шчырая куцьця.
     Am          Dm           G         C
Месяц- зводнік, коні удалыя
     Dm               Am            E             Am
Пацалунак грэшны аж да забыцьця.
```

*Прыпеў:*

```
Am          Dm       E                 Am
Пане, пане, пане гаспадару,
Dm          G                               C
Пане гаспадару, тут віна мая.
Am          Dm       G                 C
Пане, пане, пане гаспадару
Dm               Am              E                   Am
У вашу гаспадыню закаханы я.
```

Вочы, рукі, зоры залатыя,
Пад дугою бомы, хмель у галаве…
Песьня - свацця, коні удалыя,
І такі гарачы, незімовы снег.

*Прыпеў:*

KAMUNIKAT.org

**Сумны дождж**

Am G
Сумны дождж свае слезы лье
F E
На пыльны брук, на скроні алей.
Am G
Сілуэт твой амаль размыт
F E
І знікаеш ты, нібы прывід.

*Прыпеў:*

Am
Прабач, што мы не побач,

Жыцце бывае розным,

Буйней, чым вочы, слезы
Am C E
Буду сніць.
Am
Пільнуе лёс няўмольны,

І мы з табой не здольны

Вярнуць імгненні шчасця,
Am
Час спыніць.

Восенню мы спаткаліся
Першы раз з табой і ў ёй
Зараз вось развіталіся
Жоўтых лісцяў плед
Лёг табе ўслед…

*Прыпеў:*

KAMUNIKAT.org

**Купальская**

Am Dm
Зіхаціць твой след промнямі расы,
G C
А табе наўслед плачуць верасы.
Am Dm
На купальскі зніч, на паганства воч
F E
Ты мяне пакліч, не знікай у ноч.

*Прыпеў:*

Am Dm
Шчасны і ў журбе я прашу цябе
G C E
Не пакінь мяне, чуеш, не пакінь!
Am Dm
Ты мой першы дзень і апошнім днём
F E
Я прашу цябе не стань маім!

Сполахі агнёў ловяць рыбакі.
Гэта з нашых сноў выплылі вянкі,
А купальскі плёс, ён глыбей ад воч…
На русалчын лёс не знікай у ноч.

*Прыпеў:*/ 2 разы.

KAMUNIKAT.org

**У Парыжы сягоння дождж**

Am E Am
У Парыжы сягоння дождж,
$A_7$
Дождж у Лондане і Мадрыдзе.
Dm Am
Я пытаю яго: «Чаго ж
Dm E
Да мяне ты ў Менск не прыйдзеш?»
Am E Am
Я стаміўся цябе чакаць
$A_7$
Сярод чэрвеньскай летняй спёкі,
Dm G C
Гляну ў неба – а там ляцяць
Dm E
Міражы маіх мар – аблокі.

*Прыпеў:*

Am F C E
Дождж, дождж, дождж без супыну
Am F C E
Дождж, дождж, дождж да світання,
C F Dm Am
Дождж, дождж, дождж і жанчына,
Dm F E Am
Дождж, дождж, дождж і каханне.

У Нью-Ёрку сягоння дождж,
Дождж у Мэльбурне і Гаване.
Я пытаю яго: «Чаго ж
Беларусь ты забыў дазвання?»
Без цябе тут сасмяг імшар,
Абмялелі рачныя тоні,
І ў кронах кляновых хмар
Сэрца лістам барвовым тоне, тоне, тоне!

*Прыпеў:*

KAMUNIKAT.org

**І я цяпер жыву назад…**

               Dm          E                Am
Навальнічная, юная, смелая,
                 C                          C
З неслухмянай залевай кос,
  Dm                 G              C
За пяшчоту маю няўмелую
  Dm                                       E
Ты плаціла мне срэбрам слёз.
  Am                            E          Am
Вецер золкі той даўняй восені
            C                           C
Нам кілімы з лісця сцяліў,
    Dm                 G                   C
Асляплёны дагэтуль поўнямі
  Dm                              E
Я цнатлівых грудзей тваіх…

*Прыпеў:*

Dm                 G           C
І я цяпер жыву назад,
    Dm                    E           Am
Куды вяртаюцца вятры,
    Dm                      G        C
Назад, у зорны лістапад,
  Dm                         E       Am
Дзе так мяне кахала ты.
І я цяпер жыву назад,
Куды не вернуцца вятры,
Там паліць лісце лістапад
І ў ім з табой згараем мы.

Дабіблейскаю Евай грэшнаю
Ты выходзіш з паўночных сноў
Мая самая – самая першая
Мара, песня, журба, любоў.
Вось такой мне і будзеш сніцца,
Як збяруцца ў гай гады,
Два пярсцёнкі і завушніцы –
Гэта ўсё, у чым адзета ты…

*Прыпеў:*

**Над маёю Радзімаю…**

Am                                              G
Раптоўна золка раніца прачнецца.
      F                                         E
Ачнецца Сож, развеецца туман.
Am                                              G
Квітнее луг, а мне заўжды здаецца-
F                                       E
То маці разаслала свой дыван.

*Прыпеў:*

  Am                  Dm          G                    C
Над маёю Радзімаю птушкі белыя кружаць.
  Am                       Dm              E                   Am
Боль шчымліва-асінавы – смутку майго кужаль.
  $A_7$                 Dm          G                    C
Над маёю Радзімаю птушкі белыя кружаць.
  Am                       Dm              E                   Am
Боль шчымліва-асінавы – смутку майго кужаль.

Сатчэцца неба ў ручнік бабулін,
Рассыпіць захад вогненныя фрэскі.
Расчулены да слёз ты зноў пачуеш,
Як Беларусь спявае па-палеску…

*Прыпеў:*

Над маёю Радзімаю птушкі белыя кружаць.
Боль шчымліва-асінавы – смутку майго кужаль.
Над маёю Радзімаю, над маёй Беларуссю
Ангел з чорнымі крыламі ці чарнобыльскі бусел.
Над маёю Радзімаю, над маёй Беларуссю
Ангел з чорнымі крыламі ці чарнобыльскі бусел.

KAMUNIKAT.org

**Жыве Беларусь!**

Dm E Am
Буслы не заўжды асвятлялі твой шлях паходнямі
Dm E Am
І Юда не раз прадаваў у палон цябе,
Dm G C
А ты ўваскрасала з нябыту святой Пагоняю,
Dm E Am
І я як замову тады паўтараў сабе:

*Прыпеў:*

Dm E Am
Жыве Беларусь, жыве!
Dm E Am
Жыве Беларусь, жыве!
Dm E Am
Жыве Беларусь, жыве!

Am Dm G C
Пілі ад вякоў тваю кроў груганы ўсходнія,
І белы арол, як хацеў, дратаваў цябе,
А ты ўваскрасала з нябыту святой Пагоняю
І я, як замову, тады паўтараў сабе:

*Прыпеў:*

Жыве Беларусь, жыве!
Жыве Беларусь, жыве!
Жыве Беларусь, жыве!

Дык хай жа ляціць над палямі тваймі ў над гонямі
І ворагам страх, і надзею для нас нясе
Той вершнік, той рыцар, той вой, што завуць Пагоняю,
Каб кожны паверыць здалеў: Беларусь жыве!

*Прыпеў:*

Жыве Беларусь, жыве!
Жыве Беларусь, жыве!
Жыве Беларусь, жыве!

KAMUNIKAT.org

**Малітва**

Am
Ўкленчыўшы на каленях --
C
як жа пакутна жыць.
Dm                         Am
Дай нам свайго цярпеньня,--
E                    Am
Божа, дапамажы!

*Прыпеў:*
Dm
У глыбіні нябёсаў
Am
Веры маёй крыжы...
Dm                       Am
Божа, ня дай мне лёсу--
E                      Am
без Беларусі жыць.

А пілігрым-народу
шляху начы ўкажы.
Дай нам у сэрцы згоду,--
Божа, дапамажы!

*Прыпеў:*

А для Радзімы мілай
Сонца не пашкадуй.
Дай нам у справы--крылы,
Госпадзе, уратуй!

*Прыпеў:Рэфрэн:*

У глыбіні нябёсаў
Верысвятойкрыжы
Божа, ня дай нам Лёсу --
без Беларусі жыць.

KAMUNIKAT.org